Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 СТУДЗЕНЯ 2015 г. СЕРАДА № 11 (27869) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.

ДУША, ЭНЕРГІЯ, ВОЛЯ, УКЛАДЗЕНЫЯ Ў СПРАВУ, ПЕРААДОЛЕЮЦЬ ЛЮБЫЯ БАР'ЕРЫ,

упэўнены Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, які прыняў удзел у рабоце 42-га з'езда БРСМ

Год моладзі павінен запомніцца многім пакаленням

Як вядома, сёлетні год у краіне па ініцыятыве БРСМ аб'яўлены Годам моладзі. «Хацелася б, каб ён прайшоў прыкметна. Калі ён пройдзе непрыкметна — грош вам цана», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў з'езда. «Унясіце свае канкрэтныя прапановы, рэалізуйце масу мерапрыемстваў, карысных для нашага грамадства, каб гэты год запомніўся многім пакаленням», — дадаў кіраўнік дзяржавы. «Вы, маладыя людзі, гатовыя любыя сцены разбурыць, зламаць усё, што перашкаджае нашаму жыццю, павінны былі гэта спланаваць, а калі не зрабілі — зрабіце цяпер, каб правесці гэта ў Год моладзі. Я гатовы ісці з вамі ў першай шарэнзе», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што юнацтва і маладосць у грамадстве заўсёды ўспрымаліся і ўспрымаюцца як час паўнаты жаданняў і мноства магчымасцяў. «Сёння ваш лепшы час. Увасабляйце свае мары, укладвайцеся ў тое, што вы робіце. Усе свае сілы ўкладвайце ў гэту справу — душу, энергію і волю», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

«Ва ўмовах, калі супраць суверэнных дзяржаў пачынаюць выкарыстоўвацца розныя паліттэхналогіі з апорай на раздзіманне пратэстнага руху, агрэсіўнага нацыяналізму, мы бачым рэальнымі партнёрамі дзяржавы ў захаванні яе стабільнасці менавіта маладзёжныя групы патрыятычнай накіраванасці, якія не прымаюць дэструктыўныя паводзіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі беражліва і настойліва выбудоўваецца сістэма ўзаемадзеяння дзяржавы і моладзі. «Цяпер адносіны ўлады да моладзі нагадваюць час, калі дзеці выходзяць з-пад бацькоўскага крыла. Кожны з бацькоў, я ў гэтым упэўнены, жадае, каб яго сын ці дачка дабіліся ў жыцці поспеху, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Не важна, у якой сферы і на якой пасадзе, галоўнае — адбыцца як прафесіянал і як чалавек. Тое ж самае і ў краіне. Ёй аднолькава неабходны інжынеры і ўрачы, рабочыя і бізнесмены, аграномы і механізатары, ваенныя і артысты. Дрэнны для Беларусі той, хто нічога не робіць або робіць у абход закону».

Прэзідэнт сказаў, што засмуціць нядобразычліўцаў: «Не спадзявайцеся — развіццё нашага падрастаючага пакалення мы ні ў якім выпадку не пусцім на самацёк, не зробім яго беспрытульным. Мы бачым на прыкладзе іншых дзяржаў, што можа адбыцца, калі не займацца развіццём і вольным часам моладзі».

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, Беларусь, перш за ўсё вуснамі маладога пакалення, павінна дакладна і зразумела сказаць усім замежным тэатралам ад палітыкі: «Ваша драматургія на вуліцах і плошчах гарадоў свету — штучна створаны і запушчаны сцэнарый. У Беларусі ў гэтым пераканаліся. Мэта нашых нядобразычліўцаў — зрабіць моладзь той разбуральнай сляпой сілай, якая дапаможа прарвацца да ўлады замежным стаўленікам і пажывіцца за кошт будучых пакаленняў, за кошт абрабавання краіны. Гэтыя выклікі і пагрозы трэба не проста бачыць, але і рашуча ім процістаяць».

Нельга выехаць на шырокую дарогу, не пераадолеўшы старту

Кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні закрануў тэмы адукацыі і кадравай палітыкі. «Сённяшні тэхналагічны ўклад робіць свет даступным і ў пэўным сэнсе аднолькавым. Выраўноўваюцца магчымасці атрымання адукацыі і арганізацыі вытворчасці, укаранення найноўшых спосабаў лячэння і доступаў інфармацыі, правядзення даследаванняў і арганізацыі гандлю, — сказаў Прэзідэнт. — Таму, каб дабіцца камерцыйнага поспеху, навуковага прызнання, нарэшце, проста сямейнага дабрабыту, няма неабходнасці ехаць за акіян. Для гэтага не трэба нават пераязджаць з глыбінкі ў сталіцу. Усюды патрабуецца максімальнае ўкладанне ўласнай працы і настойлівасць у дасягненні мэты. Важна, каб кожны з вас як мага раней зразумеў і прыняў гэту простую ісціну».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ён ні ў якім разе не адгаворвае моладзь ад уласцівага юнацтву жадання пабачыць свет. «Паедзьце і паглядзіце, вучыцеся, калі гатовы, асвойвайце новае, пераймайце карыснае. Але наўрад ці вас чакаюць там з распасцёртымі абдымкамі. Там даўно прывыклі лічыць грошы і проста так нічога не робяць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Не цешце сябе, што там вы знойдзеце нешта асаблівае, ісціну ў апошняй інстанцыі, — сказаў Прэзідэнт. — Сёння няма сусветных цэнтраў, дзе акумуляваліся б веды. Веды рассеяны паўсюль і ствараюцца кожнае імгненне адначасова ў розных кропках зямнога шара, у тым ліку ў навуковых цэнтрах і ўніверсітэтах Беларусі. З-за гэтага змяняецца ўся ранейшая сістэма адукацыі, асабліва вышэйшай. Той, хто хоча застацца першым у сваёй сферы, у прафесіі, не перастае вучыцца ўсё жыццё».

Прэзідэнт канстатаваў, што змяняецца і роля дзяржавы ў сістэме адукацыі. «Мы павінны прадаставіць і забяспечыць кожнаму маладому чалавеку якасную базавую адукацыю, а таксама выхаванне — тое, што стане фундаментам яго асобаснай сталасці. Далей — персанальны выбар і індывідуальны шлях развіцця, шлях да вашага дабрабыту і шчасця. Ужо сёння наймальнік глядзіць не толькі на дыплом, але і на дадатковыя веды і вопыт, якія выпускнік набыў, працуючы над сабой: курсы, трэнінгі, школы, стажыроўка, навуковыя даследаванні, самастойная работа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Здавалася б, да такой сістэмы адукацыі маладое пакаленне гатова лепш, чым папярэдняе. У той жа час маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў складаюць трэцюю частку беспрацоўных, зарэгістраваных у органах службы занятасці, а гэта больш за 55 тыс. чалавек. «У чым прычына — у недахопе ведаў або ў завышаных патрабаваннях кіраўнікоў?» — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. Ён думае, што ў неапраўданых запатрабаваннях саіскальнікаў. Работы ў краіне хапае, вось толькі «зялёныя» выпускнікі ВНУ хочуць усё і адразу. Не хочуць працаваць на нізавых пасадах, лічаць, што ім належыць максімальна магчымая зарплата. Напрыклад, малады юрыст не хоча разумець, якія страты можа панесці кампанія, калі складаць шматмільённы кантракт будзе ён, а не яго больш вопытны калега. Юны інжынер хоча адразу атрымліваць зарплату генеральнага дырэктара, але не задумваецца, колькі таму давялося пераадолець цяжкіх прыступак на шляху да кіраўніцтва прадпрыемствам.

«Нічога нікому не даецца адразу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Нельга выехаць на шырокую дарогу, не пераадолеўшы старту, не разагнаўшы аўтамабіль, недзе нават не забуксаваўшы. Скажу прама: адукацыя — гэта, калі хочаце, усяго толькі вадзіцельскае пасведчанне, а здольнасць стаць лепшым спецыялістам, ісці ўверх па кар'ернай лесвіцы, да матэрыяльнага дабрабыту — гэта прафесіяналізм вадзіцеля, які выпрацоўваецца гадамі».

БРСМ адчувае сваю адказнасць

Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта выбудаваць план мерапрыемстваў на аснове прапаноў 42-га з'езда БРСМ. Прэзідэнт падкрэсліў, што ўнесеныя на з'ездзе прапановы «не маюць патрэбы ў дадатковай прапрацоўцы, каб іх падтрымаць».

СТАР. 2

СПРАВЫ МАЛАДЫХ

Найбуйнейшая маладзёжная арганізацыя краіны сабрала сваіх самых таленавітых удзельнікаў, каб вызначыць, наколькі ж «ураджайнымі» былі мінулыя тры гады працы. 42-гі з'езд Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прайшоў у Мінску. У ім прыняла ўдзел амаль тысяча актыўных членаў арганізацыі з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама прыкладна тры тысячы гасцей.

Своеасаблівым сімвалам з'езду стала яблыня: розныя народы надзяляюць гэта дрэва рознымі сімвалічнымі значэннямі, як правіла, станоўчымі. У нас жа, як патлумачылі ўдзельнікі форуму, яблыневая квецень асацыюецца яшчэ і з Вялікай Перамогай. У год сямідзесяцігоддзя БРСМ прэзентаваў рэспубліканскі патрыятычны праект «Кветкі Вялікай Перамогі». Сімвалам праекта стала кветка яблыні на чырвонаязлёнай стужцы.

Інсталяцыя з яблыневым садам была выстаўлена ў холе першага паверха Палаца Рэспублікі, дзе і сабраліся ўсе ўдзельнікі з'езду. Яблыкі, што стаялі ў вялікіх скрынях, сімвалізавалі ўраджай — дасягненні арганізацыі за апошнія тры гады.

Выканаўца абавязкаў Першага сакратара ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ расказаў пра гэты перыяд працы сваёй арганізацыі з акцэнтам на прыярытэтных кірунках, сярод якіх грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, студатрадаўскі і валанцёрскі рухі, культурна-забаўляльная дзейнасць і работа ў інтэрнэт-прасторы. Якія ж яны, гэтыя дасягненні?

СТАР. 2

КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД: мэтазгодна выдаваць законы на беларускай і рускай мовах

Канстытуцыйны суд (КС) Беларусі лічыць, што заканадаўчыя акты, якія закранаюць правы і свабоды грамадзян, мэтазгодна выдаваць і на беларускай, і на рускай мовах. Аб гэтым заявіў старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Пётр МІКЛАШЭВІЧ, зачытваючы штогадовае пасланне Прэзідэнту Беларусі і абедзвюм палатам парламента «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2014 годзе», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Канстытуцыйны суд лічыць, што цяпер для забеспячэння свабоднага доступу да правасуддзя заканадаўчыя акты, якія закранаюць правы і свабоды грамадзян, мэтазгодна выдаваць на дзвюх дзяржаўных мовах — беларускай і рускай, у адпаведнасці з палажэннямі арт. 17 Канстытуцыі аб роўнасці дзвюх дзяржаўных моў», — сказаў Пётр Міклашэвіч.

«У нас Канстытуцыя гарантуе роўнасць дзвюх моў... Хто памятае, у савецкі час у нас кодэксы складаліся з дзвюх частак. У першай нормы выкладаліся на беларускай мове, а ў другой — на рускай», — растлумачыў журналістам старшыня КС. Ён дадаў, што Канстытуцыйны суд, прымаючы пасланне, звярнуў увагу на тое, што на дзяржаўным узроўні прымаюцца меры для далейшага развіцця беларускай мовы. Таму ў КС вырашылі, што і ў юрыдычнай сферы таксама трэба зрабіць пэўныя захады.

Пётр Міклашэвіч адзначыў, што наяўнасць законаў на дзвюх мовах дапаможа пры неабходнасці весці судаводства на беларускай мове.

■ З першых вуснаў

ВЫБАРЫ ДЛЯ КРАІНЫ

У 2015 годзе ў краіне адбудуцца чарговыя прэзідэнцкія выбары. Расказаць аб тым, якой будзе выбарчая кампанія ў гэтым годзе, аглядальнік «Беларускай думкі» папрасіў старшыню Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзію Ярмошыну.

— Лідзія Міхайлаўна, у Беларусі былі прыклады ўдачных прэзідэнцкіх кампаній у летні час, напрыклад, у 1994 і 2001 гадах. Можа, не варта чакаць восені?

— Калі паглядзець каляндар выбараў у іншых дзяржавах, то, як правіла, часцей за ўсё сустракаюцца два месяцы — сакавік і лістапад. Сусветная практыка вызначыла: менавіта яны з'яўляюцца найбольш спрыяльнымі для правядзення выбарчых кампаній. Чаму? Па-першае, гэтыя месяцы не звязаны з асноўнымі святамі як рэлігійнымі, так і свецкімі, якія адзначаюць народы. Па-другое, яны не супадаюць з сезонам адпачынкаў, канікул і гэтак далей. У гэты перыяд знаходзяцца ў рабочым стане ўстановы адукацыі, дзе па агульнапрынятай практыцы размяшчаюцца ўчасткі для галасавання. Ідзе навучальны год, там завершаны рамонты, такім чынам, ёсць дзе размясціць участкі і каго прыцягнуць для работы ў выбарчых камісіях, паколькі настаўнікі традыцыйна складаюць іх асноўны касцяк. Ва ўсім свеце пры назначэнні выбараў кіруюцца перш за ўсё прагматычнымі меркаваннямі. Напрыклад, у Індыі іх даты вызначаюць сезоны дажджоў, у неспрыяльны пагодны перыяд там участкі не адкрываюць.

Фота БЕЛТА.

Што да таго, што ў нас двойчы паспяхова прайшлі прэзідэнцкія выбары ў летні перыяд у 1994 і 2001 гадах (у апошнім галасавалі ў верасні, але выбарчая кампанія выпала на летнія месяцы), то магу сказаць: тады іншага выйсця не было. 1994 год — гэта першыя выбары прэзідэнта. У той час народ чакаў яго як месію, менавіта з ім звязваў надзеі на станаўленне дзяржавы і паляпшэнне жыцця. Таму стаўленне да выбараў было як да нечага лёсавызначальнага. Цяпер мы глядзім на гэта спакайней. І калі перад выбаршчыкам паўстане пытанне: пайсці галасаваць або адправіцца, скажам, ягады збіраць, то частка людзей выбера ягады. Да таго ж у 1994 годзе насельніцтва жыло бедна, ні аб якіх адпачынках за межамі краіны размовы не ішло. Далей суседняй вёскі не ездзілі: грошай не было. Сёння, калі мы гаворым аб летнім перыядзе, то вымушаны ўлічваць — у гэты час істотная частка насельніцтва проста адсутнічае ў краіне, паколькі адпачывае за мяжой і не можа ўдзельнічаць у выбарах. Жыццё змянілася радыкальна, таму параўнанне з 1994 годам некарэктнае.

У 2001 годзе ў пэўным сэнсе таксама была асаблівая сітуацыя. У выніку рэспубліканскага рэферэндуму ў 1996 годзе тэрмін паўнамоцтваў як кіраўніка дзяржавы, так і парламента быў «абнулены» і пачаў ісці нанава. У Прэзідэнта ён завяршаўся 21 лістапада 2001 года, таму перанесці выбары на больш позні час было нельга. На той момант я ўзначальвала Цэнтральную выбарчую камісію і магу сказаць: праводзіць летам выбары вельмі нязручна і цяжка. Адпускны перыяд, спёка, рамонт школ, праблемы з фарміраваннем участковых выбарчых камісій — настаўнікі ў адпачынках... У 2001 годзе выбары прайшлі нармальна, але гэта каштавала такіх намаганняў, што паўтараць не хочацца. Ды і не трэба.

— Прэзідэнцкія выбары 2015 года пройдуць у адпаведнасці з абноўленым выбарчым заканадаўствам. Што з прававога пункту гледжання рэальна зменіцца, і як паўплывалі папраўкі ў Выбарчы кодэкс на праведзеныя ўжо кампаніі па выбарах дэпутатаў?

— Сапраўды, у параўнанні з 2010 годам закон змяніўся. У поўнай меры гэта выявілася ў 2013 годзе, хоць некаторыя навелы ў Выбарчым кодэксе былі ўнесены і раней. У 2010 годзе прымянялася ўжо такая норма, як прыватныя фінансавыя фонды кандыдатаў у прэзідэнты, але цяпер мы пайшлі далей. Па-першае, фонд, які можа стварацца кандыдатам, павялічыўся да 9000 базавых велічынь, гэта значыць у тры разы ў параўнанні з 2010 годам. Па-другое, і гэта прапанова, на якой я настойвала і рада, што яна прайшла, — права на стварэнне фонду з'явілася не толькі ў кандыдата ў прэзідэнты, але і ў саіскальніка гэтага статусу — тых, хто толькі рэгіструе сваю ініцыятыўную групу і мае намер збіраць подпісы па вылучэнні яго кандыдатам у прэзідэнты. Гэта з'яўляецца самым прынцыповым змяненнем заканадаўства адносна прэзідэнцкіх выбараў. Чаму яно з'явілася? Усім зразумела, што для таго, каб абзавесціся 100 тысячамі подпісаў для вылучэння кандыдатам у прэзідэнты, патрабуецца затраціць не толькі фізічныя намаганні, але і матэрыяльныя сродкі. Подпісы трэба збіраць на тэрыторыі ўсёй краіны, што прадугледжвае раз'езды, аплату транспартных расходаў, таго ж бензіну, напрыклад, і гэтак далей.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ААН: напружанасць вакол Украіны негатыўна адбіваецца на эканамічным становішчы краін СНД

Рост напружанасці вакол Украіны негатыўна адбіваецца на перспектывах эканамічнага развіцця большасці краін СНД. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы ААН «Сусветнае эканамічнае становішча і перспектывы, 2015», паведамляе Цэнтр навін ААН. Аўтары дакумента адзначаюць, што ў 2014 годзе тэмпы эканамічнага росту ў СНД рэзка знізіліся з прычыны геапалітычнай напружанасці. Так, тэмпы росту сукупнага валавога ўнутранага прадукту ў СНД і Грузіі скараціліся з 2% у 2013 годзе да 0,8% у 2014 годзе. Эксперты прагназуюць невялікае паскарэнне развіцця — да 1,1% у 2015 годзе і 2,1% ў 2016 годзе.

Баевікі «Ісламскай дзяржавы» пакаралі смерцю 13 падлеткаў за прагляд футбольнага матча

Баевікі «Ісламскай дзяржавы» пакаралі смерцю 13 падлеткаў, якія глядзелі матч Кубка Азіі па футболе паміж зборнымі Ірака і Іарданіі ў іракскім горадзе Масул. Пра гэта паведамляе Breaking911. Ідэолагі арганізацыі палічылі, што прагляд спартыўнай гульні з'яўляецца злачынствам, што павінна карацца смерцю. Экстрэмісты абвінавацілі 13 дзяцей у парушэнні рэлігійных законаў, пасля чаго падлеткі былі расстраляныя з кулямёта. Кубак Азіі па футболе-2015 праходзіць у Аўстраліі.

Уладзімір Клічко пагадзіўся на бой з Шэнанам Брыгсам

Чэмпіён свету па боксе ў суперцяжкай вазе ўкраінец Уладзімір Клічко даў згоду на правядзенне паядынку з амерыканцам Шэнанам Брыгсам. Пра гэта паведамляе Bild. Паведамляецца, што прамоўтэрская кампанія братоў Клічко забараніравала арэну ў Гамбургу для правядзення спаборніцтва ў верасні.

Дакладная дата невядома. Брыгс з вясны мінулага года імкнецца любымі спосабамі пераканаць Клічко правесці з ім паядынак. Ён запускаў ва ўкраінца чаравік, урываўся ў залу, дзе праходзіла трэніроўка 38-гадовага спартсмена, перашкаджаў украінцу снедаць у адным з рэстаранаў, абяцаючы абавязкова ўдарыць апанента пры сустрэчы, а таксама перакуліў Клічко ў ваду і выклаў у Instagram калаж з падзеннем баксёра.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15011>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Ад працаголіка да алкаголіка — адзін крок?

Да алкагольнай залежнасці людзей штурхаюць розныя прычыны. У прыватнасці, з алкагалізмам апынуўся звязаны працагалізм. Людзі, моцна стомленыя працай, нярэдка спрабуюць зняць стомленасць і псіхалагічную напругу алкаголем. Гэта паказалі даследаванні 330 000 работнікаў з 14 краін, у тым ліку Вялікабрытаніі, ЗША і Германіі. Зараз працягласць працоўнага тыдня ў ЕС 40 гадзін. Калі чалавек працуе па 48 гадзін, то рызыка злоўжывання алкаголем вырастае на 11%. Калі ж працоўны тыдзень даходзіць да 56 гадзін, то рызыка развіцця цяжкага алкагалізму ўзрастае на 13%. Пры гэтым высновы зроблены на аснове адказаў апытаных. У рэальнасці сітуацыя можа быць яшчэ горшай. Псіхолагі выявілі пэўную логіку: нярэдка працаголікі заахвочваюць сябе алкаголем за добрую працу. Гэта іх асабістая індульгенцыя. І сацыяльны статус або краіна пражывання не адыгрываюць ніякай ролі. Паводле даследавання, алкагалізм часцей выяўлялі ў мужчын-працаголікаў.

КОРАТКА

Нацыянальны банк абавязаў камерцыйныя банкі Беларусі ўстанаўліваць інфакіёскі з функцыяй cash-in, калі кліенты не маюць магчымасці аплачваць камунальныя плацяжы і іншыя паслугі наяўнымі ў касах.

З 20 студзеня «Белавія» пачала выкананне шостага штодзённага рэйса ў маскоўскі аэрапорт Дамадзедава.

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі ўзрос у 2014 годзе ў параўнанні з 2013 годам на 1,6 працэнта да Br778,5 трлн.

Сярэдні кошт кошыка замежных валют адносна беларускага рубля з улікам усяго комплексу мер макраэканамічнай карэкціроўкі, паводле ацэнак, можа павялічыцца да канца 2015 года на 3-7 працэнтаў.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі пакуль не атрымаў беларускага грамадзянства, але яму ўжо выдадзена пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі на два гады.

■ Жылая нерухомасць

КВАТЭРЫ, ЯК ГАРАЧЫЯ ПІРАЖКІ

Калі падводзіць папярэднія вынікі за мінулы год у сферы жыллёвай нерухомасці, то трэба падзяліць яго мінімум на два перыяды: чым жыў рынак да сярэдзіны снежня і тое, што было потым. Разам з аддзелам кансалтынгу і аналітыкі агенцтва нерухомасці «Твая Сталіца» мы паспрабавалі ацаніць перспектывы мінскай нерухомасці па лініі новабудоўлі, а таксама на другасным рынку кватэр і арэнды.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Час хуткіх рашэнняў

Спецыялісты адзначаюць, што цэнаўтварэнне летась на першасным рынку жылля Мінска характарызавалася стабільнасцю. Найбольш паказальным тут можна назваць перыяд з лютага па верасень, калі цэны былі ўраўнаважаны рынкавымі законамі і балансавалі на адзнацы 1670 долараў за квадратны метр. Аднак у другой палове снежня нестабільнасць валютных курсаў справакавала на жыллёвым рынку сур'ёзныя хваляванні.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Адгуляўшы каляду, падпішыся на «Звязду»!

Вы афармілі падпіску на першы квартал ці нават на паўгоддзе? Тады гэты напамін не для вас.

А вось тым, хто падпісаўся на газету на студзень, нагадваем: не забудзьцеся прадоўжыць падпіску на люты, сакавік і наступныя месяцы! Зрабіць гэта можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі, з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала «Белпошта», праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by альбо ў вашага паштальёна да 27 студзеня.

У кіёсках і крамах «Белсаюздруку» — да 23 студзеня.

Пра тое, што сапраўды важна, чытайце па-беларуску!